**Урбан, В. В.** Адмоўе / В. В. Урбан // Культура Беларусі : энцыклапедыя. Т. 1. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2010. – С. 59.

**АДМО́ЎЕ,** выражэнне з дапамогай лексічных і граматычных сродкаў, а таксама інтанацыі значэння процілегласці таму, што сцвярджаецца. У беларускай мове *адмоўе* выражаецца:

а) адмоўнымі часціцамі *не, ні, ані*: ***Не** чуваць у садзе птушынага шчэбету. На небе **ні** воблачка. У лесе **ані** гуку*;

б) адмоўнымі займеннікамі *ніхто, нішто, нічый, ніякі, нікольki*;

в) адмоўнымі прыслоўямі *нідзе, ніколі, нікольki, нікуды, ніадкуль, ніяк*;

г) безасабова-прэдыкатыўнымі словамі *няма, нельга, немагчыма*;

д) словаўтваральнымі прэфіксамі (словаўтваральнымі часціцамі-афіксамі) *не-, ні-, ані-*: *адабрэнне – неадабрэнне, жывы – нежывы, надоўга – ненадоўга, хто – ніхто, дзе – анідзе, як – аніяк*;

е) з дапамогай інтанацыі пры экспрэсіўным выражэнні адмоўя ў сцвярджальным сказе: *Так я вас і паслухаў!* (г.зн. не паслухаў).

*Адмоўнымі* ў беларускай мове з'яўляюцца сказы, у якіх адмаўляецца наяўнасць пэўных з'яў, падзей, дзеяння або стану. Асноўныя сродкі выражэння *адмоўя* – адмоўныя часціцы і безасабова-прэдыкатыўнае слова *няма*. Адрозніваюць сказы ***агульнаадмоўныя*** (у такіх сказах адмоўе адносіцца да дзеяслова-выказніка і выражаецца поўнае, абсалютнае адмаўленне з'яў або падзей: *Тыдзень не было дажджу.*) і ***частковаадмоўныя*** (у такіх сказах адмоўе адносіцца да любога іншага члена сказа, акрамя выказніка, і адмаўляюцца толькі асобныя рысы з'яў або падзей, якія сцвярджаюцца ў сказе: *Дождж ішоў не ўвесь тыдзень.*). Калі ў адным сказе *адмоўе* паўтараецца пры абедзвюх частках састаўнога дзеяслоўнага выказніка або пры двух членах сказа, то гэты сказ набывае сцвярджальнае значэнне: *Я не магу не падзякаваць вам за дапамогу. Гэтай ноччу ніхто не мог заснуць.* Такое *адмоўе* называецца ***падвойным***.

Словы ці марфема, якія заключаюць у сабе значэнне процілегласці таму, што сцвярджаецца, атрымалі ў лінгвістыцы тэрміналагічнае азначэнне **нега́цыя** (лац. negatio).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ